# Літаратурна-музычная гасцёўня "Зазірнем у свае карані" для людзей сталага ўзросту.

20 лютага 2020 года ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" была арганізавана літаратурна-музычная гасцёўня «Зазірнем у сваё карані» з цыклу практычных мерапрыемстваў «Размаўляем па беларуску!».

Мерапрыемства ўключала пазнавальную інфармацыю аб мястэчку Гальшаны, аб знакамітым Гальшанскім замку, яго гісторыі, легендах, а таксама аб вядомай князёўне і польскай каралеве Соф'і Гальшанскай.

У падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства прымала актыўны ўдзел наведвальнік аддзялення Ала Грыневіч.

Гісторыя свайго краю і веданне роднай мовы - гэта важная старонка жыцця кожнага чалавека.







